*А.М. Макарэвіч*

# АСАБЛІВАСЦІ РЭЙТЫНГАВАЙ АЦЭНКІ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ У КАНТЭКСЦЕ ЗАСВАЕННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: 1900–1930 гг." ПА СІСТЭМЕ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ЛІНІЙ

**Ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў па 10-бальнай шкале**. Як выкладчык, так і студэнт павінны выразна ўсведамляць, што адзнака на экзамене – гэта сумарнае падагульненне вынікаў падрыхтоўчай працы, якая ў сукупнасці яе элементаў павінна прывесці студэнта да якасных змен у працэсе яго прафесійнай падрыхтоўкі, выпрацоўкі навыкаў прафесійнай кампетэнтнасці, як гэтага патрабуе Адукацыйны стандарт. Гэта ацэнка ўсёй сістэмы працы студэнта ў семестры – фактычна вызначэнне яго прафесійнай кампетэнтнасці ў межах адпаведнай вучэбнай дысцыпліны.

**Уменні і навыкі:**

– сістэматызацыя матэрыялу (у выглядзе табліц) для агульнай характарыстыкі наступных пытанняў: 1) тэмы, матывы і вобразы паэзіі, прозы, драматургіі, 2) эстэтычныя арыентацыі аўтараў і асаблівасці іх мастацкай рэалізацыі, 3) літаратурныя сувязі, уплывы і кантакты, 4) беларуская літаратура 1900–193 гг. у кантэксце еўрапейскіх літаратурна-мастацкіх тэндэнцый;

– супастаўляльны літаратуразнаўчы аналіз паэтычных тэкстаў адной тэматычнай групы; літаратуразнаўчыя абагульненні ў выглядзе

эсэ на матэрыяле твораў адной тэматычнай групы, твораў беларускай і рускай літаратур;

– інтэрактыўныя формы творчай працы на лекцыйных і практычных занятках па літаратурным аналізе мастацкага тэксту;

– рэфератыўныя паведамленні па адпаведных тэме практычных заняткаў пытаннях;

– працяг сюжэта, развіццё канфлікту некаторых літаратурных тэкстаў з улікам аўтарскага стылю пісьменніка (напрыклад, "Няскончанай драмы" Ф. Аляхновіча);

– аналіз асаблівасцей сцэнічнай рэалізацыі некаторых твораў (напрыклад, "Яна і Я" Я. Купалы і спектакль Магілёўскага тэатра па гэтай паэме) у кантэксце аўтарскай сістэмы сэнсаўтварэння.

**Віды і формы кантролю**: практычныя заняткі, калёквіумы, кантрольныя работы з аналітычнымі, тэставымі і творчымі заданнямі, бягучыя кансультацыі, аналіз мастацкіх вобразаў у кантэксце прататыпных з'яў і аб'ектаў рэчаіснасці, выразнае чытанне на памяць тэкстаў, абавязковых для літаратуразнаўчага аналізу і інш. У пачатку семестра вызначаецца тая колькасць форм кантролю (напрыклад, ад 4-х да 8-мі), па выніках якога студэнты могуць атрымаць адзнаку. На экзамене студэнт можа ў якасці ілюстрацый да адказу карыстацца адпаведнымі напрацаванымі матэрыяламі. Набраная ў семестры колькасць балаў падсумоўваецца з адзнакай за адказ і выстаўляецца агульная (сярэдняе арыфметычнае) адзнака па выніках працы студэнта ў семестры. Калі студэнт не ўдзельнічаў у выкананні таго ці іншага задання, то бал за яго ўсё роўна выстаўляецца: нуль (ён улічваецца пры падсумаваным падліку).

**Метадычны аспект фарміравання** уменняў і навыкаў у кантэксце вызначаных відаў і форм кантролю:

– наяўнасць планаў практычных заняткаў, у якіх падрабязна і даходліва, з прыкладамі выканання адпаведных заданняў, здзяйсняецца выхад на сістэму перспектыўных ліній;

– адаптаваныя да пытанняў экзамену, практычных заняткаў, форм самастойнай працы спісы літаратурных тэкстаў, навуковых прац, тэкстаў да завучвання на памяць;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– наяўнасць электронных варыянтаў форм табліц, дзённіка чытача і інш., прыкладаў сістэматызацыі літаратурных тэкстаў з адпаведнымі заданнямі і інш.; мэта – на падставе прапанаваных прыкладаў студэнт павінен рабіць у правільнай форме і зарыентаваным змесце назапашванні, на працягу семестра дапаўняючы іх;

– у працэсе адказу на экзамене студэнт мае права карыстацца ўсімі назапашанымі ім раней матэрыяламі з мэтай пацвярджэнняў-ілюстрацый;

– абавязковы аналіз на лекцыях выкладчыкам з дапамогай студэнтаў тых тэкстаў, якія будуць прапаноўвацца для кантрольных работ, калёквіумаў і іншых форм кантролю;

– паступовае ўвядзенне студэнтаў у кантэкст працы па выкананні пэўных заданняў у адпаведнасці з прынцыпамі “ад простага да больш складанага”, “ад прыватнага да агульнага”;

– выхад на практычнае выкарыстанне назапашаных ведаў, уменняў і навыкаў, матэрыялаў у будучай працы: курсавыя і дыпломнае даследаванне, праца ў якасці настаўніка (выкладчыка), навучанне ў магістратуры, аспірантуры;

– паступовае ўвядзенне інтэрактыўных формаў працы;

– распрацоўка сістэмы самастойнай працы студэнтаў па вывучэнні пытанняў, якія не былі разгледжаны на практычных занятках, у час якіх выкарыстоўваліся інтэрактыўныя формы працы;

– абавязковае аб’яўленне ў пачатку семестра спісу тэкстаў, заданняў да іх, прыкладаў тэставых заданняў, па якіх будзе здзяйсняцца кантроль з той мэтай, каб студэнты мелі магчымасць паэтапнай падрыхтоўкі да адпаведных форм кантролю;

– аналіз выкладчыкам кантрольных работ на бягучых кансультацыях, разбор памылак і прывядзенне магчымых варыянтаў іх выпраўлення;

– абавязковая магчымасць для студэнта паўторнага выканання работы, за якую ён атрымаў нездавальняючую адзнаку альбо такую адзнаку, якая не адпавядае яго прыярытэтам у рэйтынгавай сістэме;

Усё пералічанае з’яўляецца, акрамя іншага, адпаведнай часткай сістэмы перспектыўных ліній, зарыентаванай на рэйтынгавы аспект пры ацэнцы ведаў студэнтаў на экзамене.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова